*Нацыянальныя героі*

# Выбітныя людзі першай паловы XX стагоддзя, якія найбольш паспрыялі развіццю беларускай нацыі

| | |
|---|---|
|  | **Браніслаў Эпімах-Шыпіла** (1859–1934)<br><br>**Яго дом у Пецярбургу быў асяродкам беларускай моладзі («Круг беларускі», 1902–04). Удзельнічаў у стварэнні выдавецтва «Загляне сонца і ў наша аконца» (1906), у выданні першага беларускага часопіса «Маладая Беларусь» (1912–13), спрыяў дзейнасці Беларускага нацыянальнага камітэта. Старшыня камісіі Інстытута беларускай культуры па складанні слоўніка жывой беларускай мовы (1927), перадаў у Беларускую Акадэмію Навук сваю бібліятэку з 5000 кніг.** |
|  | **Іван Луцкевіч** (1881–1919)<br><br>**Заснавальнік Беларускай рэвалюцыйнай грамады (1903), беларускіх газет («Наша доля» і «Наша Ніва», 1905–06; "Гоман", 1916–18), выдавецкіх суполак («Наша хата», 1908; Беларускае выдавецкае таварыства, 1913), першай беларускай гімназіі (Вільня, 1919).** |
|  | **Янка Купала** (1882–1942)<br><br>**Народны паэт Беларусі, класік беларускай літаратуры, адзін з заснавальнікаў новай беларускай літаратуры і мовы, духоўны лідар беларускага нацыянальнага адраджэння.** |
|  | **Якуб Колас** (1882–1956)<br><br>**Народны паэт Беларусі, празаік, драматург, крытык, публіцыст, перакладчык, вучоны, педагог, грамадскі дзеяч; адзін з заснавальнікаў сучаснай беларускай літаратуры і літаратурнай мовы.** |

*Нацыянальныя героі*

## Выбітныя людзі першай паловы XX стагоддзя, якія найбольш паспрыялі развіццю беларускай нацыі *(працяг)*

| | |
|---|---|
|  | **Уладзіслаў Галубок (1882–1937). Беларускі драматург, празаік, рэжысёр, акцёр, мастак. Народны артыст Беларусі (1928). Член Саюза пісьменнікаў СССР (1934). У 1920–35 г. працаваў у заснаванай ім Трупе беларускіх артыстаў (Вандроўны тэатр Галубка, з 1924 г. - Беларуская дзяржаўная трупа). Спектакль «Ганка» вандроўны калектыў іграў 498 разоў, толькі ў 1925 г. тэатр Галубка даў на Міншчыне звыш 150 спектакляў. У 1937 г. арыштаваны, памёр у няволі.** |
|  | **Вацлаў Ластоўскі (1883–1938). Беларускі палітычны дзеяч, пісьменнік, гісторык, філолаг, этнограф. Рэдактар газеты «Наша ніва» (1909-1914), часопісаў «Саха» (1912), газеты «Гоман» (1916-1917), «Беларускі сцяг» (1922). Аўтар «Кароткай гісторыі Беларусі» (1910). Старшыня Рады міністраў БНР (12.1919 – 04.1922). Аўтар «Падручнага расійска-крыўскага слоўніка» (1924), манументальнай «Гісторыі беларускай (крыўскай) кнігі" (1926). Выдаваў часопіс «Крывіч» (1923–27). Дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея, загадчык кафедры этнаграфіі пры Інбелкульце. Прапагандыст назвы «Крывія» для Беларусі. Акадэмік БелАН (1928). У 1930 г. арыштаваны, высланы за межы БССР. Расстраляны ў Саратаве.** |
|  | **Язэп Лёсік (1883–1940). Беларускі нацыянальны і палітычны дзеяч, пісьменнік, публіцыст, мовазнавец, педагог. Акадэмік АН БССР (1928). Старшыня Цэнтральнай рады беларускіх арганізацый (1917). Удзельнік Усебеларускага з'езда (1917). Адзін з ініцыятараў акту незалежнасці Беларускай Народнай Рэспублікі (БНР). Адзін са стваральнікаў Беларускай сацыял-дэмакратычнай партыі (1918). Старшыня прэзідыума Рады БНР (травень 1918 – снежань 1919), старшыня Найвышэйшай рады БНР (з 13 снежня 1919). Правадзейны член Інстытута беларускай культуры (1922), старшыня Тэрміналагічнай камісіі, дырэктар Інстытута навуковай мовы. Аўтар падручнікаў па беларускай мове (1922, 1924) і артыкулаў па гісторыі Беларусі. У 30-я гады некалькі разоў арыштоўваўся, загінуў пры нявысветленых абставінах у Саратаўскай турме.** |
|  | **Антон Луцкевіч (1884–1942). Беларускі палітычны і грамадскі дзеяч, публіцыст, гісторык, лінгвіст, выдавец. Адзін з заснавальнікаў Беларускай рэвалюцыйнай грамады (1903). Уваходзіў у склад рэдакцый газет «Наша доля» і «Наша ніва». Адзін з выдаўцоў газеты «Гоман». Старшыня Віленскай беларускай рады (1918), ініцыятар абвяшчэння незалежнасці БНР. Старшыня ўрада і народны сакратар замежных спраў БНР (1918). Старшыня Рады Міністраў Найвышэйшай Рады БНР (з 13 снежня 1919). Выкладаў у Віленскай беларускай гімназіі, аўтар зборнікаў «Нашы песняры» (1918), «Адбітае жыццё» (1929). Арганізаваў Беларускі музей імя І. Луцкевіча. Арганізатар Беларускага пасольскага клуба. Арыштоўваўся польскімі (1927), пазней савецкімі ўладамі (1939), асуджаны на 8 гадоў зняволення. Абставіны смерці невядомыя.** |

*Нацыянальныя героі* **Выбітныя людзі першай паловы XX стагоддзя, якія найбольш паспрыялі развіццю беларускай нацыі** ***(працяг)***

| | |
|---|---|
|  | **Максім Багдановіч** (1891–1917). Беларускіпаэт, публіцыст, літаратуразнавец, перакладчык, класік беларускай літаратуры. У Вільні, у друкарні Марціна Кухты, выдадзены адзіны прыжыццёвы зборнік твораў Максіма Багдановіча «Вянок» (1914). Паэзія Максіма Багдановіча ўвайшла ў духоўную скарбніцу беларускага народа. Пераклаў на беларускую мову вершы Верлена, Верхарна, Гейнэ, Пушкіна, Авідзія, Гарацыя, на рускую - творы Янкі Купалы, Тараса Шаўчэнкі, Івана Франко. |
|  | **Аляксандр Чарвякоў** (1892–1937). Беларускі і савецкі дзяржаўны дзеяч. Адзін з арганізатараў і кіраўнікоў Беларускай сацыял-дэмакратычнай рабочай партыі (1917–18), камісар Беларускага нацыянальнага камісарыята (люты—травень 1918). Белнацкам ставіў за мэту стварэньне беларускай савецкай дзяржаўнасьці. Адзін са стваральнікаў ССРБ (1 студзеня 1919).Камісар асветы ў яе ўрадзе, намеснік наркома асветы Літоўска-Беларускай ССР (1919). Старшыня ЦВК і СНК БССР (1920–24), старшыня ЦВК БССР (1924–37). Вялікую ўвагу надаваў умацаванню і развіццю беларускай савецкай дзяржаўнасці, нацыянальнай культуры, асветы. Абвінавачаны ў антысавецкай дзейнасці, скончыў жыццё самагубствам. |
|  | **Браніслаў Тарашкевіч** (1892–1938). Беларускі грамадска-палітычны дзеяч, моваазнавец. Акадэмік АН Беларусі (1928). Адзін з лідэраў БСГ (1917). Загадчык культурна-асветнага аддзела Белнацкама. Стварыў першую «Беларускую граматыку для школ» (1918). Пераклаў на беларускую мову «Іліяду» Гамера і «Пана Тадэвуша» А.Міцкевіча. Загадчык беларускага сектара дэпартамента асветы Сярэдняй Літвы (1920). Дырэктар Віленскай беларускай гімназіі (1921). Абраны паслом у польскі сейм (1922), старшыня Беларускага пасольскага клуба (1922–24). Прыняты ў КПЗБ (1926). Двойчы трапляў у польскую турму (1928, 1932). У выніку абмену палітзняволенымі, выехаў у СССР (1933). Прыгавораны да расстрэлу паводле фальшывых абвінавачванняў (1938). |
|  | **Рыгор Шырма** (1892–1978). Беларускі харавы дырыжор, фалькларыст, грамадскі і музычны дзеяч, публіцыст. Арганізатар хора ў Пружанах (1924), хора Беларускага саюза студэнтаў у Вільні (1926). Узначаліў Таварыства беларускай школы (1927–36). Прачытаў сотні лекцый па беларускай культуры, выдаў зборнікі «Беларускія народныя песні» (1929) і «Наша песня» (1938). Сядзеў у Лукішскай турме ў Вільні. Арыштаваны, высланы ў Паўночны Казахстан (1942). Мастацкі кіраўнік і галоўны дырыжор Дзяржаўнай акадэмічнай харавой капэлы БССР (1939-1970). Народны артыст БССР (1949) і СССР (1955). Аўтар запісаў, музычнай апрацоўкі каля 5000 беларускіх народных песень. |